**У БДУ ПАСТУПІЛА РЭКОРДНАЯ КОЛЬКАСЦЬ ЗАМЕЖНІКАЎ**
Інтэрв'ю з прарэктарам Канстанцінам КАЗАДАЕВЫМ
Стар. 2

**АКАДЭМІЧНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ**
Замежныя студэнты і выпускнікі расказалі пра вучобу ў БДУ і жыццё ў Беларусі
Стар. 4–5

**ЛЯЦЯЦЬ У НЕБЕ ЖУРАВЫ...**
Літаратурная суполка «Узлёт» як альма-матар беларускіх паэтаў
Стар. 6

**РЭНЕСАНС БІБЛІЯТЭКІ**
Як адпавядаць рэаліям інфармацыйнага грамадства, ведаюць у ФБ БДУ
Стар. 8



Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

31 снежня 2019 года, № 16 (2222)





## *Дарагія калегі і студэнты!*



*Віншую ўвесь шматтысячны калектыў БДУ з надыходзячым Новым годам і Калядамі! Мы знаходзімся напярэдадні чароўных святаў, напоўненых дабром, надзеяй і новымі сэнсамі.*

*Я ўдзячны кожнаму з вас за дасягненні, датычнасць і неабыякавасць да БДУ, імкненне памнажаць яго вынікі, умацаваць імідж універсітэта і падзяліць яго паўсядзённыя задачы.*

*Наперадзе нас чакаюць новыя выклікі, адкрыцці і магчымасці. Таму жадаю кожнаму, пры відавочнай супярэчлівасці і неадназначнасці свету, заставацца вернымі сабе, сваёй місіі, захаваць адданасць БДУ на карысць яго далейшага развіцця. Хай надыходзячы год будзе напоўнены цяплом, утульнасцю, разуменнем, павагай і ўзаемнасцю. Здароўя, дабрабыту, яркіх уражанняў вам і вашым сем'ям!*

*Са святамі!*

***Рэктар БДУ Андрэй Кароль***

# Курсам на росквіт БДУ!

У 2019 годзе працягнулася паступальнае развіццё ўніверсітэта ў адукацыйнай, навуковай і інавацыйнай сферах. Прывядзём найбольш значныя вынікі года.

## КАДРАВАЯ ПАЛІТЫКА І ЭКАНОМІКА

- колькасць аступененых супрацоўнікаў – **52 %**;
- на **19,8 %** выраслі прыбыткі комплексу БДУ за кошт прыбыткаў ад экспарту адукацыйных, навуковых паслуг і навукаёмістай прадукцыі. На **40 %** павялічаны даход ад дадатковых адукацыйных паслуг;
- агульная сума экспарту паслуг па комплексе – больш за **9,3** млн долараў, што істотна перавышае гадавы план;
- па комплексе БДУ тэмп росту прадукцыйнасці працы да тэмпу росту заработнай платы склаў **1,02** (каэфіцыент);
- у агульным аб'ёме экспарту адукацыйных паслуг па Міністэрстве адукацыі доля БДУ склала **25 %;**
- на **15,4 %** у сярэднім вырасла заработная плата ўсіх катэгорый супрацоўнікаў, у тым ліку выплаты за кошт уласных сродкаў БДУ – на **9,3 %**;
- выраслі бюджэтнае фінансаванне капітальных выдаткаў універсітэта і ўкладанні ўласных сродкаў у развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы:
  - у **1,4** раза да 1 млн рублёў павялічана фінансаванне інфарматызацыі,
  - у **1,6** раза (амаль да 5,8 млн руб.) павялічаны выдаткі на рамонт.

## АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫЙ

- **упершыню** ў БДУ праведзены конкурс на атрыманне грантаў рэктара для падрыхтоўкі кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый;
- за год абаронена **9** доктарскіх і **57** кандыдацкіх дысертацый.

## РАЗВІЦЦЁ СІСТЭМЫ КРЭАТЫЎНАЙ АДУКАЦЫІ

- інфраструктуру БДУ папоўнілі **новыя IT-сэрвісы**: электронная заліковая кніжка студэнта, электронны расклад заняткаў і журнал куратара, індывідуальны план выкладчыка;
- усё больш выкладчыкаў укараняюць у адукацыйныя практыкі элементы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Адукацыйным парталам на базе LMS Moodle суправаджаюцца **1 644** навучальныя дысцыпліны, карыстальнікамі з'яўляюцца больш чым **12 000** чалавек;
- у актыве выкладчыкаў БДУ больш за **500** аўтарскіх метадычных распрацовак заняткаў з выкарыстаннем тэхналогій праблемнага, даследчага і эўрыстычнага навучання па розных дысцыплінах.

## МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

- у верасні створаны **Сумесны інстытут БДУ–ДПУ**;
- дасягнуты дамоўленасці з кітайскімі ўстановамі пра адкрыццё **5** сумесных магістарскіх праграм двайнога дыплома;
- усталявана партнёрства з асноўнымі ўніверсітэтамі КНР: Пекінскім універсітэтам, Шанхайскім універсітэтам транспарту, Кітайскім універсітэтам камунікацый;
- РІКК адзіны на постсавецкай прасторы ганараваны звання «ўзорны»;
- РІКК БДУ адзінаму за межамі Кітая нададзена права праводзіць Міжнародны кваліфікацыйны экзамен для перакладчыкаў кітайскай мовы;
- у г. Санья (КНР) адкрыўся падрыхтоўчы цэнтр БДУ, у якім навучаецца **150** абітурыентаў;
- адкрыты сумесныя адукацыйныя праграмы з вядучымі ВНУ, такімі як: МДУ імя М. В. Ламаносава, РУДН, універсітэт Молдэ і інш.;
- прыняты першыя магістранты па сумеснай магістарскай праграме БДУ і МДУ «Гісторыя беларускай дыяспары»;
- колькасць англамоўных праграм БДУ папоўнілася **4** магістратурамі.

## БДУ Ў МІЖНАРОДНЫХ РЭЙТЫНГАХ

- прадстаўлены ў **11** глабальных і **7** прадметных рэйтынгах і ўпэўнена ўваходзіць у лік **1,5 %** найлепшых універсітэтаў свету;
- БДУ адзіны з Беларусі ўключаны ў некалькі новых сусветных рэйтынгаў:
- БДУ ў два разы палепшыў пазіцыі ў сусветным рэйтынгу Best Global Universities і размясціўся на **346** радку.

## НАВУКА Ў БДУ

- сумесна з Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэтам створана галіновая лабараторыя прыкладных касмічных тэхналогій;
- створаны стартап-цэнтр БДУ;
- сфарміравана **5** навучальна-навукова-вытворчых кластараў;
- навукова-тэхнічная прадукцыя БДУ была прадстаўлена на **39** выставах у **11** краінах;
- у БДУ было праведзена **81** міжнароднае і **19** рэспубліканскіх навуковых мерапрыемстваў, **2** стартап-конкурсы;
- **кожны трэці** студэнт, уключаны ў рэспубліканскі банк адоранай моладзі, навучаецца ў БДУ;
- калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ганараваны **Граматы Міністэрства адукацыі** як найлепшая ўстанова, што ажыццяўляе падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі.

## КУЛЬТУРА І СПОРТ

- у арганізацыі II Еўрапейскіх гульняў прынялі ўдзел больш за **1300** валанцёраў-студэнтаў БДУ, **14** з іх адзначаны ўзнагародамі;
- створана жаночая баскетбольная каманда «БДУ-Цмокі», якая выступае ў вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі;
- мужчынская футбольная каманда РЦАР БДУ замацавалася ў вышэйшай лізе;
- жаночая футбольная каманда «Зорка-БДУ» заняла другое месца на XXVIII чэмпіянаце Беларусі.

УНІВЕРСІТЭТ
31 снежня 2019 года, № 16 (2222)

# У БДУ паступіла рэкордная колькасць замежных студэнтаў

Прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі Канстанцін КАЗАДАЕЎ распавёў пра вынікі самай паспяховай прыёмнай кампаніі замежных студэнтаў, пра прывабнасць дыплома БДУ, а таксама пра новыя адукацыйныя магчымасці.


Канстанцін Казадаеў і рэктар Сіньянскага педуніверсітэта Лі Цзюн

Перавагі адукацыі ў Беларусі: прымальная аплата навучання, добрыя суадносіны кошту і якасці, бяспека, прастата асіміляцыі, даволі мяккі клімат. Выпускнікі БДУ працуюць у 120 краінах свету. Многія спецыялісты, якія атрымалі дыплом БДУ, цяпер займаюць добрыя пасады, будуюць кар'еру, развіваюцца як прафесіяналы сваёй справы

***– Замежных студэнтаў у БДУ значна дадалося, чым абумоўлена такая папулярнасць нашай ВНУ?***

– Калі летась колькасць тых, хто паступіў, была роўная 1542, то сёлета ў наш універсітэт залічаны на навучанне 2233 замежныя грамадзяніны з улікам дадатковых адукацыйных паслуг (стажыроўкі, моўныя курсы, летняя школа рускай мовы, павышэнне кваліфікацыі і інш.). На першую ступень вышэйшай адукацыі – 997 чалавек, у магістратуру – 335, у аспірантуру – 38, на падрыхтоўчае аддзяленне факультэта даўніверсітэцкай адукацыі – 596.

Калі гаварыць пра лічбы ў разрэзе факультэтаў, то ў першую пяцёрку па найбольшай колькасці прынятых патрапілі эканамічны факультэт (329), філалагічны (280), міжнародных адносін (220), журналістыкі (142), юрыдычны (85).

У колькасных адносінах асноўны рост адбыўся з-за значнага павелічэння ліку тых, хто паступае на першую ступень навучання, таксама магістрантаў у БДУ стала прыкметна больш, чым гэта было на год раней. Вялікі набор замежных грамадзян у 2019 годзе абумоўлены ў першую чаргу актывізацыяй супрацоўніцтва з кітайскімі ўніверсітэтамі і адукацыйнымі цэнтрамі ў межах Года адукацыі Беларусі ў Кітаі. За апошні год адбылося некалькі візітаў кіраўніцтва БДУ ў Кітай, падпісаны важныя дамовы пра акадэмічнае партнёрства, адкрыты сумесны інстытут з Далянскім політэхнічным універсітэтам. Было праведзена мноства мерапрыемстваў па прыцягненні абітурыентаў, і гэта праца прынесла плён. Што да абітурыентаў з Туркменістана, то іх колькасць вырасла за кошт змен у заканадаўстве краіны. Мінадукацыі Туркменістана зацвердзіла пералік замежных ВНУ, дзе рэкамендуецца вучыцца туркменскім студэнтам, і ў гэтым спісе ад Беларусі прадстаўлены толькі БДУ, што выклікала пераразмеркаванне студэнтаў з іншых ВНУ краіны ў нашу. Можна адзначыць таксама павелічэнне колькасці стажораў і слухачоў курсаў з Узбекістана, з якім падпісана «дарожная карта развіцця». Немалаважна, што ў БДУ пачалі праводзіць больш летніх школ і праграм дадатковай адукацыі дарослых, і ў гэтым заслуга факультэтаў, якія распрацоўваюць унікальныя праграмы і запрашаюць замежных грамадзян у іх удзельнічаць.

***– З якіх краін прыязджаюць да нас на вучобу?***

– Можна сказаць, што на працягу апошніх гадоў мы паступова нарошчвалі колькасць замежных студэнтаў на ўсе ступені адукацыі. Сёння ў БДУ навучаецца каля 3,7 тыс. замежных грамадзян з амаль 70 краін свету. Па апошніх звестках, у БДУ вучацца 474 магістранты, 129 аспірантаў, таксама 651 слухач факультэта даўніверсітэцкай адукацыі.

Калі гаварыць пра нацыянальны склад замежных навучэнцаў, то прыкладна 84 % з іх – гэта грамадзяне Кітайскай Народнай Рэспублікі (51 %), Туркменістана (24 %) і Расіі (9 %). Акрамя гэтага, у БДУ прыязджаюць вучыцца грамадзяне з Таджыкістана, Казахстана, Узбекістана, Азербайджана, Арменіі і астатніх краін СНД, Ірана, Турцыі, В'етнама і іншых дзяржаў.

Маладыя людзі зрабілі свой выбар на карысць атрымання адукацыі ў найлепшай беларускай ВНУ, ацаніўшы якасць выкладання, выбар спецыяльнасцяў (рыхтуем кадры міжнароднага ўзроўню больш чым на 80 спецыяльнасцях у гуманітарных і прыродазнаўчых кірунках), матэрыяльна-тэхнічную базу, шырокую сетку міжнароднага супрацоўніцтва і шэраг іншых пераваг.

***– Наколькі каціруецца дыплом БДУ за мяжой? Што высоўвае на першы план замежны абітурыент пры выбары ўніверсітэта?***

– Як правіла, на прывабнасць дыплома ўплывае сусветная ацэнка ВНУ. Таму, калі абітурыент прымае рашэнне пра тое, куды накіраваць свае дакументы, ён зважае на месца ВНУ ў сістэме рэйтынгаў. БДУ ўдзельнічае ў 11 глабальных і 7 прадметных рэйтынгах. Сярод іх асобна можна адзначыць «вялікую тройку» самых аўтарытэтных сусветных агенцтваў, якія працуюць толькі з наймацнейшымі ВНУ свету: QS World University Rankings (БДУ на 351 радку), Times Higher Education (1001+ з 1258 ВНУ), Шанхайскі рэйтынг ВНУ (401-500 месца ў групе найлепшых па фізіцы). Мы маем вельмі добрыя паказчыкі, знаходзячыся ў 1,5 % найлепшых сусветных ВНУ сярод амаль 30 000 універсітэтаў свету. Пры гэтым мы працягваем працу па паляпшэнні паказчыкаў.

***– Распавядзіце пра супрацоўніцтва з іншымі ўніверсітэтамі. Як у БДУ можна атрымаць двайны дыплом? На якіх факультэтах гэта даступна, на якіх праграмах?***

– Вось ужо больш за 7 гадоў мы актыўна супрацоўнічаем з іншымі ўніверсітэтамі і кампаніямі ў галіне сумесных адукацыйных праграм. Тут прадугледжваецца выдача двайнога дыплома: БДУ і арганізацыі-партнёра, які рэалізуе навучанне ў замежжы. Гэта і I ступень па схеме «2+2» (два гады навучання ў Беларусі і два ў другой краіне) ці па іншых варыянтах, і II ступень па схеме «1+1». Такая выдатная магчымасць ёсць у Міжнародным дзяржаўным экалагічным інстытуце імя А. Д. Сахарава БДУ і на наступных факультэтах: эканамічным, гістарычным, міжнародных адносін, журналістыкі, механіка-матэматычным, фізічным, ідзе праца па адкрыцці САП на філфаку і ФПМІ.

Рэалізуюцца наступныя адукацыйныя праграмы:

– з Чанчунскім інстытутам міжнароднай камерцыі (падрыхтоўка ажыццяўляецца па рускай філалогіі і журналістыцы, I ступень);

– з Хэнанскім універсітэтам (кірунак – журналістыка, I, II ступені);

– з Таджыкскім нацыянальным універсітэтам (па схеме «2+2» на спецыяльнасцях «прыкладная інфарматыка», «камп'ютарная бяспека», «матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі»);

– таксама варта вылучыць працу эканамічнага факультэта і Вышэйшай школы Мітвайда – універсітэта прыкладных навук (Германія) па II ступені;

– ёсць унікальная праграма з Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам, дзе адкрыта магістратура па праграме «Гісторыя беларускай дыяспары» (першы год навучання ў МДУ, а другі – у БДУ);

– атрымаць два дыпломы можна ў Сумесным інстытуце Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта і БДУ. У гэтай структуры на тэрыторыі Кітая цяпер навучаецца 237 чалавек. Характэрна тое, што ўжо сёлета мы ўпершыню набралі на навучанне беларускіх абітурыентаў у структуру, якая функцыянуе ў Беларусі на базе БДУ. Тут ужо навучаюцца 58 студэнтаў. Студэнты СІБД маюць магчымасць атрымаць адукацыю на базе адразу дзвюх вядучых ВНУ, удасканаліць валоданне англійскай мовай, атрымаць базавы курс кітайскай мовы. Міжнародныя стажыроўкі, а таксама супрацоўніцтва з Кітайска-беларускім індустрыяльным паркам «Вялікі камень» дазволяць студэнтам стаць кваліфікаванымі спецыялістамі міжнароднага ўзроўню.

***– Якія асноўныя падыходы ў БДУ ў дачыненні да замежных студэнтаў?***

– Прыцягненне замежных студэнтаў немагчымае без стварэння камфортнага псіхалагічнага клімату ў краіне знаходжання. У БДУ стопрацэнтнае засяленне для замежных студэнтаў – усе яны размяшчаюцца ў студэнцкіх гарадках. У дадатак гэта поўнае дакументацыйнае суправаджэнне, якое забяспечваюць упраўленне міжнародных сувязяў і факультэт даўніверсітэцкай адукацыі. УМС увесь час падтрымлівае кантакты з навучэнцамі і дапамагае вырашаць пытанні, калі яны ўзнікаюць. Таксама ўсе навучальныя групы БДУ маюць куратараў-выкладчыкаў, якія падтрымаюць, дадуць параду ў любой сітуацыі.

Варта адзначыць, што актыўна замежная моладзь удзельнічае ў студэнцкіх арганізацыях, выяўляе сябе ў навуковай, спартыўнай, культурнай сферах. Замежных студэнтаў чакаюць у Савеце зямляцтваў БДУ, у склад якога ўваходзіць больш за 200 чалавек з 16 краін (Азербайджан, Таджыкістан, Туркменістан, Узбекістан, Эквадор, Расія, Казахстан, краіны Афрыкі і Блізкага Усходу). Праца савета накіравана на тое, каб ствараць спрыяльныя ўмовы для замежных навучэнцаў ва ўніверсітэце, праводзіць мерапрыемствы па адаптацыі замежнікаў да ўмоў пражывання ў краіне, азнаямленне з беларускай культурай, традыцыямі.

**Гутарыла
Алена ЛЯЎШЭНЯ**

## Замежных студэнтаў у БДУ становіцца больш




Інфаграфіка Валерыі БАНДАРЧЫК

# Падведзены вынікі конкурсу «Найлепшы моладзевы праект БДУ–2019»

Конкурс праводзіцца штогод і накіраваны на падтрымку і развіццё студэнцкіх ініцыятыў, а таксама стварэнне ўмоў для рэалізацыі дзяржаўнай моладзевай палітыкі ва ўніверсітэце.

На I этапе конкурсу, які адбыўся ў снежні 2018 года, экспертная камісія разгледзела 43 заяўкі. У выніку дапамога ў рэалізацыі была прапанавана 32 праектам, у тым ліку 26 праектаў атрымалі грашовы грант.

Студэнцкія ініцыятывы «Найлепшага моладзевага праекта БДУ–2019» мелі розную накіраванасць. У конкурсе былі прадстаўлены:

- валанцёрскія праекты: «Школа валанцёраў БДУ», «Філфак дзецям»;
- адукацыйныя праекты: «Адукацыйная праграма „Вяршыня“», «Віртуозы навукі БДУ», «Курсы вядучых БДУ», «Крок за крокам», «Псіхалагічная студыя PsyFox», «Асветніцкі лекторый», «Дні прававога інфармавання», «Школа рэдактараў БДУ»;
- культурна-масавыя праекты: «Міжуніверсітэцкі паэтычны форум», «Смачныя вандроўкі», «Літаратурны конкурс „БрамаМар“», «Калядны дабрачынны баль»;
- экалагічныя праекты: «Зялёны ўніверсітэт»;
- спартыўныя праекты: «Ваенна-спартыўная гульня на мясцовасці „Зарніца“», «Лёгкаатлетычны прабег BSU night trail».

Па выніках адкрытай абароны праектаў камісія размеркавала месцы наступным чынам:

## Гран-пры

**«Адукацыйная праграма падтрымкі студэнцкага актыву Студэнцкага гарадка БДУ „Вяршыня“».** Кіраўнік – *Хрысціна Кановіч* (https://vk.com/khristi_kononovich). Куратар – *Гаморына Ганна Ігараўна*.

Мэта. Навучанне, развіццё і падтрымка органаў студэнцкага самакіравання Студэнцкага гарадка БДУ, фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі навучэнцаў, фарміраванне кадравага патэнцыялу.

Рэалізацыя. У рамках праекта «Адукацыйная праграма падтрымкі студэнцкага актыву Студэнцкага гарадка БДУ „Вяршыня“» ў сакавіку –чэрвені 2019 года былі праведзены лекцыі, дыскусіі, кансультацыі, трэнінгі, круглыя сталы, прэс-канферэнцыі па наступных напрамках: студэнцкае самакіраванне, прафілактыка правапарушэнняў і парушэнняў правілаў пражывання ў інтэрнатах навучэнцаў БДУ, інфармацыйная дзейнасць, культурна-масавая і спартыўна-аздараўленчая работа.

Таксама ў рамках праекта былі праведзены серыі майстар-класаў:
«Скажы „Так“ сваёй ідэі»
«Тайм-менеджмент»
«Барацьба характараў»
студэнцкі «Форум-тэатр»
«КУЛ: Клуб Упэўненых Ідэй».

## Намінацыя «Універсітэт»

**1 месца. «Зялёны ўніверсітэт».** Біялагічны факультэт. Кіраўнік – *Кацярына Сычык* (https://vk.com/capybara_me). Куратар – *Сахвон Віталь Валер'евіч*.

Мэта. Павышэнне пісьменнасці студэнтаў па пытаннях экалогіі.

Рэалізацыя. На працягу года праектнай камандай былі зладжаны экалагічныя квэсты, прагляды фільмаў на тэму экалогіі, сустрэчы з экспертамі для студэнтаў на розных факультэтах. У канцы лістапада на біялагічным факультэце былі ўсталяваныя кантэйнеры для паасобнага збору смецця.

**2 месца. «Міжуніверсітэцкі паэтычны форум».** Факультэт журналістыкі. Кіраўнік – *Алена Давідовіч* (https://vk.com/elena_davidovich). Куратар – *Драбеня Фёдар Валянцінавіч*.

Мэта. Папулярызацыя літаратурнай дзейнасці ў вышэйшых навучальных установах Беларусі і садзейнічанне творчаму росту паэтаў і чытальнікаў – студэнтаў і супрацоўнікаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі.

**3 месца. «Курсы вядучых БДУ».** Упраўленне па справах культуры. Кіраўнік – *Ганна Гукіш* (https://vk.com/gukishan). Куратар – *Жукаў Іван Васільевіч*.

Мэта. Падрыхтоўка студэнтаў-канферансье для правядзення мерапрыемстваў універсітэта.

## Намінацыя «Факультэт»

**1 месца. «Віртуозы навукі БДУ».** Хімічны факультэт. Кіраўнік – *Лізавета Бандарчык* (https://vk.com/vavirra). Куратар – *Цабкала Жанна Анатольеўна*.

Мэта. Папулярызацыя хіміі як навукі з дапамогай стварэння наглядных сродкаў навучання.

Рэалізацыя. У рамках праекта студэнты праводзяць выязныя навукова-папулярныя лекцыі, прафарыентацыйныя мерапрыемствы, дэманстрацыйныя эксперыменты для дзяцей і дарослых.

**2 месца. «Псіхалагічная студыя PsyFox».** Факультэт філасофіі і сацыяльных навук. Кіраўнік – *Анастасія Сарокіна* (https://vk.com/id224534461). Куратар – *Фафанава Галіна Аляксандраўна*.

Мэта. Фарміраванне псіхалагічнай кампетэнтнасці і павышэнне псіхалагічнай культуры, развіццё прафесійна важных (псіхалагічных) якасцяў і грамадска значнай актыўнай жыццёвай пазіцыі студэнтаў БДУ.

**3 месца. «Літаратурны конкурс „БрамаМар“».** Факультэт журналістыкі. Кіраўнік – *Дар'я Смірнова* (https://vk.com/darsimora). Куратар – *Капцаў Уладзімір Анатольевіч*.

Мэта. Дапамагчы маладым літаратарам заявіць пра сябе, атрымаць экспертную ацэнку твораў і каштоўныя парады па майстэрстве ад вядомых беларускіх літаратараў.

**Падрыхтаваў
Антон КУПЧЫН**




## ПРЫЗНАЧЭННІ

***Прарэктарам па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях прызначана Аксана ЗДРОК. Адпаведны загад ад 26.12.2019 падпісаў рэктар БДУ Андрэй Кароль.***



**Здрок Аксана Мікалаеўна** нарадзілася ў 1973 годзе ў г. Данецк (Украіна). Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

У 1995 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ па спецыяльнасці «правазнаўства». У 1997 г. – аспірантуру ВНУ, а ў 2013 г. – факультэт перападрыхтоўкі Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «кіраванне персаналам». У 1999 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Абарона правоў і інтарэсаў непаўналетніх у грамадзянскім судаводстве», а ў 2019 г. – доктарскую на тэму «Прымірэнчыя працэдуры ў цывілістычным працэсе».

Кар'ера ў БДУ пачалася з 1997 г. Прайшла шлях ад выкладчыка кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта да загадчыка дадзенай кафедры.

З 2008 да 2016 года працавала ў Нацыянальным цэнтры заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі на пасадзе начальніка аддзела даследаванняў у сацыяльнай сферы Інстытута прававых даследаванняў. З'яўлялася членам працоўных груп па падрыхтоўцы шэрагу законапраектаў, у тым ліку законаў Беларусі «Пра трацейскія суды» (2011 г.), «Пра медыяцыю» (2013 г.), канцэпцыі закона «Пра адвакатуру і аказанне юрыдычнай дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь» (2011 г.), канцэпцыі адзінага Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Беларусі (2016 г.), праекта закона «Пра ўнясенне змен і дадаткаў у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях медыяцыі» (2018–2019 гг.).

З'яўляецца членам Беларускага рэспубліканскага саюза юрыстаў, РГА «Белая Русь», Саюза жанчын БДУ. Ажыццяўляе актыўную грамадскую дзейнасць па развіцці медыяцыі ў Беларусі. З 2013 па 2017 год – член савета і трэнер навучальна-практычнай установы «Цэнтр «Медыяцыя і права» пры Беларускім рэспубліканскім саюзе юрыстаў, распрацоўшчык адукацыйных праграм у сферы медыяцыі, аўтар і кіраўнік адукацыйнага праекта «Сямейная медыяцыя». У 2016 г. атрымала пасведчанне медыятара кваліфікацыйнай камісіі па пытаннях медыяцыі Міністэрства юстыцыі Беларусі. У 2018 г. прызначана намеснікам дырэктара Міжнароднага навукова-адукацыйнага цэнтра медыяцыі і трацейскіх працэдур юрыдычнага факультэта БДУ.

У навуковыя інтарэсы ўваходзяць пытанні грамадзянскага і гаспадарчага судаводства, прававога статусу непаўналетніх, параўнальнага правазнаўства, медыяцыі і іншых альтэрнатыўных спосабаў вырашэння спрэчак.

Аўтар 160 навуковых прац, у тым ліку дзвюх манаграфій. Удзельнічала ў падрыхтоўцы падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, навукова-практычных каментароў да ГПК і КАШС, Беларускай юрыдычнай энцыклапедыі, юрыдычнага даведніка для насельніцтва. У 2017 г. атрымала грант Прэзідэнта Беларусі ў адукацыі на распрацоўку першага ў краіне навучальнага дапаможніка па медыяцыі.

Член навукова-кансультатыўнага савета пры Вярхоўным Судзе Беларусі, рэдакцыйнага савета навукова-практычнага часопіса «Сучаснае права» (РФ). Падрыхтавала аднаго кандыдата навук. Ганаравана вышэйшай юрыдычнай прэміі «Феміда» ў намінацыі «Наватар». Лаўрэат конкурсу на прыз імя У. Д. Спасовіча (2019 г.)

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: мікрабіялогіі, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі; сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання; лічбавай эканомікі; камп'ютарнага мадэлявання; англійскага мовазнаўства; гісторыі новага і найноўшага часу; гісторыі паўднёвых і заходніх славян

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: фізіялогіі чалавека і жывёл; міжнароднага менеджменту; этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: заалогіі; генетыкі; біяхіміі; агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі; малекулярнай біялогіі; батанікі; тэхналогій праграмавання; тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі; сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання; радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій; міжнароднай палітычнай эканоміі; карпаратыўных фінансаў; тэорыі і гісторыі дзяржавы і права; грамадзянскага працэсу і працоўнага права; дзяржаўнага кіравання; філасофіі і метадалогіі навукі; сацыяльнай камунікацыі; фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі; тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай; гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў; гісторыі паўднёвых і заходніх славян; гісторыі Расіі; этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: тэхналогій праграмавання; тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі; радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій; міжнароднай палітычнай эканоміі; карпаратыўных фінансаў; лічбавай эканомікі; канстытуцыйнага права; фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці; энергафізікі; вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі; англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў; мытнай справы; англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў; раманскіх моў.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне па рабоце з персаналам, тэл. 209-54-36.*

Універсітэт
31 снежня 2019 года, № 16 (2222)

У БДУ навучаецца каля 3700 замежных грамадзян з амаль 70 краін, і яны сталі звыклай з'явай на кожным факультэце. Газета «Універсітэт» даведалася, якія ўражанні ў прыезджых студэнтаў ад вучобы і краіны, якія парады яны могуць даць новым студэнтам для таго, каб хутчэй асвоіцца на новым месцы.



# Замежныя студэнты і выпускнікі пра вучобу ў БДУ і жыццё ў Беларусі

**Басан КУРБАНАВА, Туркменістан, філалагічны факультэт: «Трэба быць гатовым да адказнасці»**



– Лічу ўзровень атрыманых ведаў дасягненнем хутчэй самога студэнта, чым універсітэта!

Бо, калі няма жадання вучыцца, ніякі прафесар не навучыць. Дарэчы, на маім філфаку выкладчыцкі склад проста неверагодны: прафесіяналы сваёй справы, спагадныя і проста вельмі добрыя. Для мяне галоўнае ў вучобе – каб выкладчык змог знайсці падыход да студэнта, інакш я проста не захачу яго слухаць. Добра, што ўсе выкладчыкі групы для замежных студэнтаў былі найлепшымі на факультэце.

Савету зямляцтваў БДУ я прысвяціла 4 з паловай гады студэнцтва: ва ўніверсітэце мы арганізоўвалі нацыянальныя святы, літаратурныя вечары, падарожнічалі па Беларусі. А яна вельмі прыгожая: першае, што відаць яшчэ да прызямлення, – гэта лясы, густыя, якія распасціраюцца на шматлікія кіламетры. Людзі, якія мне сустракаліся, даволі адкрытыя, добрыя і заўсёды гатовыя дапамагчы. Гэта краіна з прыгожай прыродай і прыгожымі людзьмі!

Я магу даць адну параду: трэба быць гатовым да адказнасці. Важна разумець, што, знаходзячыся ў чужой краіне, трэба паважаць яе асновы, і, нягледзячы на тое, што большасць людзей добразычлівыя, усё залежыць ад таго, як вы самі будзеце ўспрымаць сваё новае асяроддзе.

**Раўшэн АТОЕЎ, Туркменістан, механіка-матэматычны факультэт: «Самы важны навык – уменне ў патрэбны момант знайсці, зразумець і ўжыць»**



– У БДУ я навучыўся вучыцца! Веды ў галаве недаўгавечныя, калі імі не карыстаешся, а вось уменне ў патрэбны момант нешта знайсці, зразумець і ўжыць – гэта важнейшы навык, чым быць хадзячай энцыклапедыяй. Тут я атрымаў звышдастаткова асобаснага досведу: майстэрства зносін з людзьмі, праца ў камандзе, удзел у канферэнцыях, міжнародных праграмах абмену, публікаваў навуковыя артыкулы і г. д.

Апроч вучобы я займаўся армрэстлінгам і самба, працаваў у службе бяспекі інтэрната, арганізоўваў мерапрыемствы. Я б хацеў застацца тут жыць. У Беларусі ёсць усё неабходнае для добрага жыцця, і нават крыху больш, варта толькі прыкласці трохі высілкаў для рэалізацыі сваіх жаданняў. Галоўнае не забываць, навошта вы прыехалі, і рухацца да пастаўленай мэты, без адхіленняў на «бурлівую» маладосць, таму што не паспееш азірнуцца, як усё страціш, і не факт, што будзе яшчэ адна спроба пачаць нанова.

**Раміль ГУСЕЙНАЎ, Азербайджан, факультэт міжнародных адносін: «Я стаў спецыялістам»**



– Вучоба на ФМА сфарміравала мяне як асобу і прафесіянала: я стаў спецыялістам у галіне міжнародных адносін і атрымаў досвед вядзення перамоў.

На факультэце я займаўся грамадскай дзейнасцю ў «Старце», я скончыў універсітэт, таму перадам свой досвед малодшым курсам. Беларусь – класная краіна – і людзі, і прырода выдатныя. Тут закон і парадак, вельмі спакойна і бяспечна.

Замежным абітурыентам раю больш камунікаваць з беларусамі і не саромецца ўдасканальваць сваю мову.

**Алена ДРАЦЕНКА, Казахстан, факультэт філасофіі і сацыяльных навук: «Усё выдатна наўкол, дзе б мы ні былі»**



– БДУ – гэта класічны ўніверсітэт, накіраваны больш на навуковую дзейнасць. Мая спецыяльнасць «медыцынская псіхалогія» наўпрост звязана з асобасным развіццём. Я заўважаю, як атрыманыя веды ўплываюць на мае погляды і рашэнні.

Я староста групы і куратар першакурснікаў, удзельнічаю ў мерапрыемствах кафедры і ўніверсітэцкім праекце «Студэнт БДУ на тыдзень». Людзі тут талерантныя, адкрытыя для дапамогі, але хацелася б пажадаць ім быць больш рашучымі. Я сама сутыкнулася з тым, што моцна сумавала па доме на першым курсе, таму хачу пажадаць абітурыентам цярпення і ўважлівасці, спыніцеся і зірніце, як усё выдатна наўкол.

**Эльжбета СКШЫДЛЕЎСКА, Польшча, юрыдычны факультэт: «Перш чым прыехаць, пастаўце для сябе мэты»**



– БДУ – гэта платформа з велізарнай колькасцю розных магчымасцяў. Ад удзелу ў навуковых канферэнцыях да грамадскіх мерапрыемстваў, у рамках якіх мы можам рэалізоўвацца – атрымліваць новыя веды, асвойваць практычныя навыкі. У БДУ праводзіцца шмат розных канферэнцый, майстар-класаў – заўсёды для сябе можна знайсці што-небудзь цікавае.

За 4 гады навучання ў БДУ чаго толькі мы ні рабілі: ад харэаграфічных пастановак да судовых! На першым курсе цалкам акунулася ў студэнцтва: большую частку часу адводзіла на грамадскія, культурныя мерапрыемствы, якія арганізоўваліся намі ці факультэтам. На старэйшых курсах больш увагі надавала навучальнай, а таксама навуковай дзейнасці, я стала студэнтам года–2018 у галіне навукі.

Я даволі шмат падарожнічаю і магу сказаць, што Беларусь – гэта сапраўды вельмі чыстая краіна. Сталіца, асабліва падчас II Еўрапейскіх гульняў, проста заквітнела, а калі вы займаецеся спортам, тут створаны ўсе ўмовы для развіцця.

Тут вельмі шмат цікавай архітэктуры, шпацыруючы, зважайце на гэтыя цудоўныя вулачкі і будынкі. Лічу, што хоць бы раз варта з'ездзіць кудысьці для абмену досведам – вы ўбачыце, наколькі можа адрознівацца менталітэт людзей, логіка іх мыслення – гэта дзівосныя рэчы, якія мы можам прасачыць у іншых краінах.

Перш чым прыехаць, пастаўце для сябе мэты: ад вывучэння ўсіх выбітнасцяў у Беларусі да звання найлепшага замежнага студэнта БДУ...

**Ката АР, Германія, філалагічны факультэт і ФМА: «Падрабязна спытайце ў самым пачатку вучобы, як усё арганізавана»**



– Я прыязджала ў БДУ некалькі разоў па абмене. Мне спадабаўся корпус філфака, тое, што я магла шчыльна займацца вывучэннем рускай мовы, у нас была маленькая група, што таксама выдатна. Мая руская мова стала нашмат лепшай, я пазнаёмілася з прыемнымі людзьмі.

Прыязджаць лепш ужо з базай рускай мовы, так будзе лягчэй, гэта ключ да камфортнага пражывання тут: каб гаварыць з людзьмі і хутчэй стаць часткай грамадства. Важна быць адкрытым і размаўляць з іншымі. Раю займацца спортам ці хадзіць у групы па інтарэсах, гурткі – гэта таксама дапамагае хутчэй асвоіцца. Дарэчы, сістэма навучання адрозніваецца ад нямецкай. Таму не паўтарайце маіх памылак: падрабязна спытайце ў самым пачатку вучобы, як усё арганізавана ва ўніверсітэце, як праходзяць іспыты.

**Рахмаіл ДАЎЛАТАЎ, Таджыкістан, эканамічны факультэт: «Кожны дзень адточваў прафесійнае майстэрства»**



– Пасля ФМА я працягнуў сваё навучанне ў магістратуры і атрымаў тры прафесіі: з'яўляюся мытнікам, дыпламатам і эканамістам. Універсітэт нам заўсёды дапамагаў знайсці добрае месца для практыкі па спецыяльнасці, я быў у пасольстве Рэспублікі Таджыкістан і РУП «Белмытсэрвіс», тут добрыя калектывы. Магу ўпэўнена сказаць, што набыў нямала спецыяльных навыкаў, дарма часу не губляў і кожны дзень дзякуючы кіраўнікам адточваў прафесійнае майстэрства.

Таксама я быў старшынёй таджыкскага зямляцтва, дзе выявіліся мае добрыя лідарскія і арганізатарскія якасці. Калі мая першая радзіма – гэта Таджыкістан, то несумненна магу сказаць, што другая мая Радзіма – гэта Беларусь! Краіна лагодных і добразычлівых людзей, магчымасцяў і свабод.

Замежным студэнтам, якія прыязджаюць, хачу параіць шмат. Па-першае, хай вучацца добра, каб уздымалі імідж універсітэта яшчэ вышэй, і прадставілі сваю краіну годна, і, вядома, атрымалі добрую адукацыю. Хай і нялёгка, але, калі пройдзеш гэты шлях, потым усведамляеш, наколькі гэта прыемна. Паспрабуйце максімальна наведваць заняткі і ўдзельнічаць у цікавых мерапрыемствах. І я лічу, што кожны студэнт павінен навучыцца хаця б адной новай замежнай мове да канца вучобы, бо БДУ дае для гэтага ўсе магчымасці.

**Сунь ФАНЦІ, Кітай, факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій: «Пабольш камунікуйце з беларусамі і не бойцеся задаваць пытанні»**



– Я задаволены вучобай. Выкладчыкі заўсёды рады дзяліцца ведамі, таму раю да іх часцей падыходзіць. Яны дапамагаюць з хатнімі заданнямі і на іспытах. Апроч вучобы я займаюся вусным і пісьмовым перакладамі, гутару з беларусамі. Беларусь – чыстая і прыгожая краіна, тут можна добра адпачыць у лесе ці ля возера, шашлыкі вельмі смачныя! Вучыцца рускай мове з нуля лепш на падрыхтоўчым факультэце, пабольш камунікуйце з беларусамі і не бойцеся задаваць пытанні!

**Люсіль БУСКЕ, Францыя, філалагічны факультэт: «Атрымлівайце асалоду ад свайго знаходжання тут»**



– Я вучылася рускай мове ў групе для замежных студэнтаў, навучаннем вельмі задаволена. Ва ўніверсітэце я засяродзілася на вучобе, а пасля заняткаў атрымлівала асалоду ад Мінска, падарожнічала па Беларусі, хадзіла на балет, у кіно, у бары. Гэтак жа, як мы праводзім свой вольны час у Францыі. Я люблю Беларусь і Мінск! Тут самыя добрыя людзі, і краіна вельмі захапляльная. Хачу параіць пабо-









лей камунікаваць з людзьмі і атрымліваць асалоду ад свайго знаходжання тут.

**Амансултон БАХЦІЁРАВА, Таджыкістан, факультэт сацыякультурных камунікацый: «Універсітэт навучыў мяне думаць у правільным кірунку»**



– Я заўсёды марыла вучыцца за мяжой, і пасля школы вырашыла працягнуць адукацыю ў іншай краіне. Абрала спецыяльнасць «сучасныя замежныя мовы», бо марыла стаць перакладчыкам. Універсітэт навучыў мяне думаць у правільным кірунку. Тут я атрымала вельмі добрыя веды па сваёй спецыяльнасці, досвед самастойнага жыцця, здольнасць ужывацца з рознымі людзьмі, уменне самастойна атрымліваць веды і шмат цікавых знаёмстваў з людзьмі з розных краін.

Я з'яўляюся актывісткай савета зямляцтваў – гэта добраахвотная студэнцкая арганізацыя, закліканая дапамагаць замежным навучэнцам адаптоўвацца да ўмоў гарадскога жыцця, у якім бурлівае студэнцкае асяроддзе.

Апроч вучобы, я займаюся танцамі, і калі ў нас праходзяць фэсты і мерапрыемствы, то я заўсёды імкнуся прымаць у іх удзел і прадстаўляць сваю культуру. Таксама савет зямляцтваў праводзіць розныя экскурсіі па Беларусі – добрая магчымасць пазнаёміцца з культурай і традыцыямі гэтай краіны.

Пражыўшы ў Беларусі пяць гадоў, я шчыра палюбіла гэту незвычайную краіну. Прырода Беларусі выклікае захапленне ў любую пару года. Тут вельмі спакойна і можна шпацыраваць уначы з сябрамі па горадзе, не асцерагаючыся за сваю бяспеку.

У Беларусі праходзяць цікавыя фэсты і святы, якія варта наведаць. Таксама ёсць вельмі добрыя ўстановы, дзе можна правесці час з сябрамі, і рэстаранчыкі з самабытнай беларускай кухняй.

Беларускі дзяржаўны універсітэт – самая прэстыжная ВНУ Беларусі. Тут шырокі выбар факультэтаў і спецыяльнасцяў, у студэнтаў ёсць магчымасць удзельнічаць у навуковых канферэнцыях і культурных мерапрыемствах, а таксама спартыўных секцыях. У параўнанні з краінамі Заходняй Еўропы, у БДУ невысокі кошт навучання. І для замежных студэнтаў прапануецца пражыванне ў камфартабельных інтэрнатах.

**Тахірджон АЛІЕЎ, Таджыкістан, аспірант БДУ: «Няма ніякай дыскрымінацыі ў атрыманні якаснай адукацыі»**



– Я і іншыя замежныя студэнты ўпэўнены, што нам вельмі пашанцавала. Мы вучымся і жывём у сталіцы, тут прыязная атмасфера. За ўвесь перыяд навучання нас ні разу не спынілі і не папрасілі пашпарт. Гэта вельмі характэрна для любога замежніка: важна ўліцца ў грамадства і не пачувацца ізгоем. Многія мае сябры засталіся жыць у Беларусі і ўжо маюць сем'і, мне б таксама гэтага вельмі хацелася. Вось чаму я вырашыў навучацца тут далей у магістратуры і аспірантуры.

За гады навучання ў БДУ я зразумеў, што няма ніякай дыскрымінацыі ў атрыманні якаснай адукацыі, – гэта вельмі важна для замежных студэнтаў. У нас у Таджыкістане высока цэніцца дыплом БДУ: пасля навучання ў Беларусі мы становімся запатрабаванымі спецыялістамі, на нас глядзяць як на прафесіяналаў.

Калі я ўзначальваў студэнцкую арганізацыю Савет зямляцтваў БДУ, мы маштабна праводзілі мерапрыемства Наўруз. Тут для любога замежнага студэнта адчынены ўсе дзверы, абы было жаданне.

Асноўная задача для замежных студэнтаў – займацца вучобай, для гэтага трэба ўсвядоміць, навошта вы прыехалі ў гэту краіну. Кожны можа быць упэўнены, што калі ён таленавіты, то гэты талент раскрыецца ва ўніверсітэце, тут ёсць Савет зямляцтваў БДУ, куды ўваходзяць замежныя студэнты, якія паказваюць сябе як творчыя натуры. Калі вы сумняваецеся, хачу сказаць, што вы будзеце рады свайму выбару пасля заканчэння ўніверсітэта, гавару з уласнага досведу. Зразумеў, што гэта адзін з самых найлепшых выбараў у маім жыцці. Застаецца пажадаць толькі веры ў сябе!

**Хуршэда ТАДЖЫБАЕВА, Таджыкістан, МДЭІ імя А. Д. Сахарава: «Вывучайце беларускую культуру загадзя і будзьце больш прамалінейныя, чым у сябе дома»**



– Пасля двух гадоў навучання ва ўніверсітэце я смела магу сказаць, што вельмі задаволена вучобай і абранай спецыяльнасцю, выкладчыкамі, перспектывамі працаўладкавання, тут добрая матэрыяльная база і інтэрнат.

Мая галоўная парада замежным студэнтам: вывучайце беларускую культуру загадзя і будзьце больш прамалінейныя, чым у сябе дома. А чужую прамалінейнасць не ўспрымайце як асабістую абразу. Часта мы становімся больш адчувальнымі ўдалечыні ад дому, і нас могуць кранаць цалкам бяскрыўдныя рэчы. Улічвайце гэта! Хутчэй за ўсё, чалавек вам не ўсміхнуўся таму, што ён заняты сваімі думкамі і клопатамі, ці ў яго дрэнны настрой, але не таму, што вы яму не падабаецеся. Вас могуць папрасіць, напрыклад: «Зачыні акно!» – без усякіх «калі ласка», і гэта не грубіянства, а функцыянальная камунікацыя. Успрымайце гэта як культурную асаблівасць.

Калі ты з чымсьці не спраўляешся, то не трэба адразу тэлефанаваць бацькам і жаліцца. Яны ўдалечыні ад нас, і любыя нашы перажыванні яны ўспрымаюць як вялікую праблему, трэба пераадольваць свае цяжкасці самім, бо мы ўжо студэнты! Спакойна раскажыце бацькам сітуацыю, не робячы з дробязнай праблемы глабальную.

**Ахмед АЛБУХАЙДАР, Ірак, аспірант біялагічнага факультэта: «Белая краіна з ласкавым сонцам»**



– Мой навуковы кіраўнік Андрэй Уладзіміравіч дапамагае мне ў навуковай дзейнасці, і сам чалавек вельмі добры. Я скончыў бакалаўрыят у Іраку і адпрацаваў адзін абавязковы год інтэрнатуры ў бальніцы для жывёл. А потым вырашыў паступаць у Беларусь – выдатная краіна, белая – бо ўзімку тут снег, а сонца не такое агрэсіўнае, каб нашкодзіць скуры. У магістратуры я вучыўся са студэнтамі з Ірака, Лівіі і Кітая. Падабаецца, што тут з размахам святкуюць, урачыста адзначаюць Новы год і Дзень Перамогі.

**Чжысянь ФУ, Кітай, факультэт філасофіі і сацыяльных навук: «Аднагрупнікі сталі для мяне сям'ёй»**



– Я вучуся філасофіі на бакалаўрыяце, на апошнім 4 курсе. Вельмі рады, што ў мяне атрымалася сюды паступіць, ажыццявіць сваю мару, я хацеў вучыцца ў найлепшай ВНУ. А ў Беларусі гэта БДУ. Краіна выдатная, тут спагадлівыя людзі і добрае прыроднае асяроддзе. Філасофія – няпростая галіна, не хаваю, што мне бывае цяжка. Аднагрупнікі вельмі разумныя і сардэчныя, часта мне дапамагаюць у цяжкасцях, за гэта я ім вельмі ўдзячны. Для мяне яны і універсітэт ужо сталі сям'ёй. Я нават падрыхтаваў праграму для кітайскай моладзі, якая рэкамендуе БДУ і жыццё ў Беларусі.

**Ван НАОМІ, Кітай, магістрантка факультэта філасофіі і сацыяльных навук: «Мы з сябрам вучымся ў БДУ, пачуваюся ў бяспецы»**



– Мой сябар вучыўся ў БДУ, і мы хацелі быць разам, я прыехала сюды. Я, як і ён, абрала вучобу тут, таму што лічу, што БДУ – найлепшы універсітэт у Беларусі. Тут выдатныя і высокакваліфікаваныя выкладчыкі. І Мінск таксама ўтульны горад. У мяне часта ўзнікаюць цяжкасці з вучобай, як у лінгвістычным, так і ў навучальным плане, але мае аднагрупнікі-магістранты прыязныя. Выкладчыкі таксама заўсёды гатовыя дапамагчы нам, і мне гэта вельмі падабаецца. Жывучы тут, я заўважала прыхільнасць беларусаў да кітайцаў, у адрозненне ад рускіх. Я пачуваюся тут бяспечна, тым больш што эканамічны ціск у Беларусі нямоцны, кошты не вельмі высокія, што важна для замежных студэнтаў.

**Гадам ЧАРЫЕЎ, Туркменістан, філалагічны факультэт: «Павага адзін да аднаго стаіць на першым месцы»**



– Я абраў БДУ ў сувязі з высокім рэйтынгам ВНУ, добрай якасцю адукацыі і зручным месцазнаходжаннем – Беларусь у цэнтры Еўропы. Мне падабаюцца замежныя мовы, менавіта таму я абраў філалагічны факультэт. Можна было пайсці ў МДЛУ, але на філфаку акрамя самой мовы мы вывучаем літаратуру і гісторыю. Мая будучая праца сапраўды будзе звязана з французскай і англійскай мовамі.

Вучоба цяжкая для тых, хто сапраўды вучыцца, я бяру ўдзел у штогадовых канферэнцыях студэнтаў. З'яўляюся старшынёй Савета зямляцтваў БДУ і ўдзельнічаю ва ўніверсітэцкіх падзеях. Больш за ўсё ў нашым універсітэце мне падабаюцца адносіны паміж студэнтамі і выкладчыкамі. Павага адзін да аднаго стаіць на першым месцы, заўсёды можна знайсці агульную мову. Мінчукі гасцінныя, я люблю наведваць утульныя куткі Мінска.

**Сунь БАЙЛУН, Кітай, магістрант філалагічнага факультэта: «Тут я магу здейсніць сваю мару і рэалізаваць сябе як асобу»**



– Нягледзячы на тое, што прайшлі толькі кароткія чатыры месяцы, як я прыехаў вучыцца ў БДУ – жыццё з гэтых час было вельмі змястоўным і плённым. Я яшчэ больш глыбока пазнаёміўся з беларускай мовай, паколькі я пачаў вывучаць яе яшчэ ў Пекінскім універсітэце замежных моў. Таксама я палепшыў рускую мову і атрымаў веды па сваёй спецыяльнасці, якія спатрэбяцца ў будучыні. Спачатку было цяжка з адаптацыяй, бо адзін патрапіў у незнаёмую краіну, дзе ўсё – мова, культура, клімат, ежа – іншае, чым дома. Але, на шчасце, у нас ёсць добрыя і патрабавальныя выкладчыкі, якія не толькі выразна тлумачаць кожны пункт на занятках, але і дапамагаюць нам справіцца з вучобай новага этапу. Мне вельмі падабаецца вучыцца ў БДУ.

**Надзея МАРХЕЛЬ**

УНІВЕРСІТЭТ
31 снежня 2019 года, № 16 (2222)

# Ляцяць у небе журавы...

## Літаратурнае аб'яднанне БДУ «Узлёт» як alma mater беларускіх паэтаў

**Першы ўніверсітэт на гістарычных беларускіх землях з пачатку свайго існавання стаў клапаціцца пра маладыя літаратурныя кадры. Тут выступаў перад студэнтамі Янка Купала, яму адрасаваў сваё пасланне Якуб Колас, прысвячаў паэтычны зборнік Мікола Аўрамчык, тут сталела і гартавалася паэзія Кандрата Крапівы, Пятра Глебкі, Петруся Броўкі, тут пачыналі свой творчы шлях Сяргей Законнікаў, Алесь Разанаў, Яўгенія Янішчыц і многія іншыя майстры «высокага слова».**

З універсітэтаў усё і пачыналася. Факультэт свабодных мастацтваў Сарбоны ў Парыжы знаходзіўся на вуліцы Саломы: такімі дзеля гігіены былі ўмовы інтэрнацкага побыту. Сталіцай паэтаў, артыстаў, спевакоў, музыкантаў на доўгія часы стаў Арлеан, дзе сыходзіліся шляхі творцаў.




### Арляняты беларускай паэзіі

Беларуская зямля здаўна ўдосталь нараджала паэтаў. Першы ўніверсітэт па-бацькоўску апекаваўся маладымі літаратурнымі кадрамі. У 1923 г. ***Янка Купала*** чытаў перад студэнтамі свой верш «Арлянятам», прысвечаны моладзі абноўленага краю. Тры дары – «ваша маладосць, прасторныя, шырокія дарогі ў жыццё, ваш уклад у навуку, у паэзію, у мастацтва, у справу будаўніцтва», – адзначаў народны пісьменнік Беларусі ***Якуб Колас*** на сустрэчы ў пасланні «Сябрам — студэнтам», надрукаваным у газеце «Беларускі ўніверсітэт» 15 лістапада 1952 г. У 1922 г. ***Алесь Гурло***, супрацоўнік Інбелкульта, напісаў верш-гімн «Беларускаму ўніверсітэту». «Яшчэ ты малады...», «і толькі год адзін» ... «Прайдуць гады, магутныя дары пажне з пашанай ён. Пад зыкі музыкі, пад гусляў родных звон з дзвярэй тваіх павыйдуць песняры, тварцы навукі, прарокі пачуцця, як выйшлі з сцен краёў суседніх нам». «Навукі вольны храм» – называў паэт свой універсітэт. «У беларускую літаратуру прыйшло маладое паслярэвалюцыйнае пакаленне, – пісаў у аўтабіяграфіі ***Кандрат Крапіва***. – У 1926 годзе, калі мне было ўжо трыццаць гадоў, я паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт». «Бурным патокам хлынулі ў літаратуру новыя, свежыя, маладыя сілы» (***Алесь Звонак***). «Фармаванню маіх літаратурных поглядаў значна спрыяла навучанне ў БДУ», – адзначаў ***Пятро Глебка***. «Пачаліся заняткі, і тут высветлілася, што вершы піша багата маіх аднакурснікаў, і сярод іх П. Глебка, С. Дарожны, В. Казлоўскі. Гэта група з дзесяці чалавек стала студыяй „Маладняка“ БДУ, яе лічылі ўзорнаю і даручылі апекавацца над ёю ўжо вядомаму празаіку *Міхасю Зарэцкаму*. Мы збіраліся, адольвалі разам літаратурную грамату, чыталі і разбіралі свае творы», – прызнаваўся ***Максім Лужанін***. «З 1928 года я вучыўся ў БДУ. Большасць студэнтаў нашага курса былі пісьменнікі: *С. Баранавых, Я. Скрыган, П. Броўка, А. Пальчэўскі, І. Дуброўскі, В. Каваль, М. Шалай, С. Куніцкі, А. Сідарэнка* і іншыя складалі творчае ядро, якое фактычна задавала тон усяму жыццю курса», – прыгадаў ***Мікола Хведаровіч***. Вучыліся П. Трус, А. Вольны, А. Дудар, А. Бабарэка, С. Хурсік, Т. Хадкевіч, М. Чарот, М. Зарэцкі, В. Шашалевіч, М. Грамыка, С. Дарожны, Я. Бобрык, А. Александровіч, М. Ларчанка, Т. Кляшторны, А. Салагуб, С. Ліхадзіеўскі, С. Фамін.



Паэту, прафесару **Алегу Антонавічу ЛОЙКУ** былы «ўзлётавец» *Канстанцін Цыбульскі* прысвяціў верш, які стаў песняй у адказ на верш А. А. Лойкі. Там ёсць такія словы:

*Ляцяць у небе журавы,*
*Я рады іх палёту.*
*А важаком – канешне Вы,*
*Хто крылы даў «Узлёту»!*

Паэтычныя прысвячэнні кіраўніку «Узлёту» А. А. Лойку выказалі студэнты, якія пазней сталі знакамітымі на Беларусі творцамі, вядомыя паэты і калегі ў літаратуры: М. Арочка, І. Багдановіч,Т. Барысік, А. Брусевіч, А. Вярцінскі, В. Гардзей, Ю. Голуб, М. Дукса, Л. Забалоцкая, В. Зуёнак, Г. Каржанеўская, М. Маляўка, М. Мятліцкі, Г. Праневіч, В. Рагойша, К. Цыбульскі, В. Шніп, А. Шушко, Я. Янішчыц.

*Яўгенія Янішчыц* у вершы «Прафесар», напісаным у 1973 годзе падчас практыкі ў ГДР студэнтаў-філолагаў, у якой кіраўніком групы з'яўляўся прафесар А. А. Лойка, адзначала:

*Без Вашай лёгкае рукі,*
*Нам прадаўжацца ў новай песні,*
*Шчырэць між зла і між бясед.*
*...Глядзіць прафесар,*
*як прадвеснік,*
*Запамінальна ўсім услед.*

### Універсітэцкія студыі і літаб'яднанне «Узлёт»

Мэтанакіраваным стаў клопат пра маладыя літаратурныя кадры ў БДУ ў пасляваенны час. Выходзяць альманахі, паэтычныя зборнікі: «Падарунак» (1958), «Веснавыя ўсходы» (1961), «Узлёт» (1965), «Натхненне» (1967), «Універсітэт паэтычны» (1971), «Вёсны» (1977), «Вусны» (1985), «Квадра» (1990).

Навуковымі кіраўнікамі паэтычных універсітэцкіх студый станавіліся прафесары ***Ю. Пшыркоў***, ***І. Навуменка***, ***А. Лойка***.

Найбольшую ролю ў падрыхтоўцы літаратурнай моладзі ў БДУ адыграла **літаратурнае аб'яднанне «Узлёт»**, якое ўзнікла ў 60-я гады і праіснавала да канца дваццатага стагоддзя, аб'яднаўшы сотні маладых паэтаў, якія ў розныя часы вучыліся ва ўніверсітэце, пакінуўшы яркі след у творчым станаўленні новай генерацыі беларускага прыгожага пісьменства. Яе менавіта так і называлі – універсітэцкім ці філалагічным пакаленнем, якое моцна ўзняло эстэтычны ўзровень літаратуры. Яно вырастала менавіта ва «Узлёце», якім нязменна кіраваў прафесар **Алег Лойка**. «А я з сорак пятага, а я з сорак пятага, равеснік дня Перамогі і выбуху першага атамнага», – так абазначыў ідэю гэтага пакалення паэтаў ***Рыгор Семашкевіч***, у пазнейшыя гады дацэнт кафедры беларускай літаратуры. Трапіць у паэтычны зборнік БДУ лічылася вялікім гонарам. Выходзілі асобныя зборнікі паэзіі старэйшых, кшталту «Універсітэцкага гарадка» ***М. Аўрамчыка***. «Узлёт» стаў новай прыступкай маладых літаратурных сіл у Беларусі, якімі былі на пачатку дваццатага стагоддзя «Маладняк», «Полымя», «Узвышша», «Мінскі перавал» і інш. Не перарывалася сувязь часоў і пакаленняў. Без залішняй сціпласці можна сказаць, што за дваццатае стагоддзе сіламі старэйшых і маладзейшых пісьменнікаў, у тым ліку выхаваных у сценах БДУ, была створана шматаблічная і развітая ў жанрава-стылёвых адносінах высокамастацкая беларуская літаратура. Скаральнікамі вяршынь беларускай літаратуры сталі пісьменнікі, якія вучыліся ў БДУ і ніколі не парывалі творчых сувязяў са студэнтамі і выкладчыкамі. Дзякуючы плённай творчай дзейнасці літаратурнага аб'яднання «Узлёт» вырасла яркая генерацыя выдатных творцаў у Беларусі. У адрозненне ад пушкінскай Таццяны, якая прывыкла гаварыць па-французску, магла «изъясняться с трудом на языке своём родном», гэта былі беларускамоўныя паэты – мысліцелі новай эпохі. «Узлёт» – адметная ўніверсітэцкая паэтычная эпоха. Цэнтрам культуры і новага грамадства заўсёды быў і застаецца ўніверсітэт. Нацыянальным сімвалам сталі ўніверсітэцкія паэты-ўзлётаўцы.

Ды будзь ты хоць паэт Афанасій Фет, ты мусіш любіць свой універсітэт! Годная плеяда ўніверсітэцкіх паэтаў папоўніла магутны склад новай беларускай літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI ст. З'явіліся карыфеі паэзіі *Яўген Хвалей, Любоў Тарасюк, Васіль Сахарчук, Мікола Мятліцкі, Людміла Забалоцкая, Рыгор Семашкевіч, Пятро Сушко, Мар'ян Дукса, Міхась Губернатараў, Юрка Голуб, Алесь Пісьмянкоў, Уладзімір Дзюба, Валянціна Коўтун, Алесь Разанаў, Віктар Ярац, Галіна Каржанеўская, Яўгенія Янішчыц*. Кожны новы зборнік паэзіі прыносіў новыя імёны. Сёння «ўзлётаўцы» – у авангардзе беларускай літаратуры: *Алесь Бельскі, Казімір Камейша, Мікола Маляўка, Алесь Бадак, Уладзімір Мазго, Леанід Пранчак, Яўген Гарадніцкі, Генадзь Пашкоў*. «Прагну выраю.//Хопіць нарэшце спакою.//Вырастаю з ціхае вёскі...» – спавядаўся другакурснік ***Алесь Бадак***.

«Узлёту» споўнілася 20, а ім, «узлётаўцам», заўсёды заставацца ў гэтай «вілцы» – паміж 17 і 22 гадамі, – у самых рамантычных гадах свайго жыцця – гадах студэнцкай маладосці, мараў, надзеяў...» – пісаў у прадмове да зборніка «Вусны» кіраўнік літаб'яднання ***Алег Лойка***. Кожны новы зборнік – паэтычная справаздача літаб'яднання. Васямнаццаць «узлётаўцаў» было прадстаўлена ў анталогіі «Універсітэт паэтычны» (1971), выдадзенай да 50-годдзя ўніверсітэта. «Вясна. Звон сакавіцкіх ручаёў. Пралескавы блакіт красавіка. Майская залева сонца. У карагодзе пор года яна – адна. У кругабегу жыцця чалавечага – адна. А ў паэзіі, калі раптам гурт юнакоў і дзяўчат стукаецца ў яе высокія, заўсёды загадкавыя брамы?.. – пісаў у прадмове да зборніка „Вёсны“ Алег Лойка. – Пра адну вясну тут ужо не скажаш. Вёсны, дваццаць вёснаў грукаціць на прыступках да яе высокасці паэзіі – дваццаць сакавікоў, красавікоў, маёў – роўна столькі, колькі хлопцаў і дзяўчат выступае ў гэтай кнізе». Юнацкай жыццярадаснасцю, матывамі дружбы і кахання поўняцца перш за ўсё і вершы «ўзлётаўцаў». Маладыя ўніверсітэцкія паэты па-вясноваму раскрываюць перад светам і людзьмі свае сэрцы насцеж.

### «Альтанка», «КЛУмБА» як працяг традыцый

Сёння на філалагічным факультэце дзейнічае літгурток паэтаў **«Альтанка»**, якім кіруе дацэнт ***Ірына Багдановіч***. Традыцыі «ўзлётаўцаў» жывуць і працягваюцца. Вядомы штогадовы літаратурны конкурс «Славянскі калейдаскоп». Прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі яшчэ студэнтамі ***Таццяна Куприянец, Кацярына Роўда, Кацярына Стройлава***. Выходзяць зборнікі паэзіі і літаратурныя альманахі. Пры Фундаментальнай бібліятэцы аб'ядналася кола творчых студэнтаў **«КЛУмБа»**. Выхоўваць і раскрываць новыя паэтычныя таленты дзеля духоўнага ўзбагачэння Беларусі – адна з місій Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта сённяшняга часу.

**Уладзімір НАВУМОВІЧ,**
**сябар прэзідыума**
**Саюза пісьменнікаў Беларусі**

### Дарэчы

У маі 2019 г. на філалагічным факультэце БДУ адбылася прэзентацыя кнігі пра Алега Лойку «Чалавек з сонечнаю ўсмешкай», каардынатарамі выдання сталі былыя «ўзлётаўцы», калегі паэта-прафесара А. А. Лойкі загадчык кафедры гісторыі беларускай літаратуры *Алесь Бельскі* і дацэнт *Анатоль Верабей*.












# Кар'ерны форум БДУ: праца для студэнтаў ці студэнты для працы?

Штогадовы Кар'ерны форум БДУ прайшоў 5 снежня ў функцыянальнай прасторы IMAGURU. У ім прынялі ўдзел 16 кампаній і больш за 300 студэнтаў. Хуткія сумоўі, знаёмства з кампаніямі, карысныя лекцыі – газета «Універсітэт» даведалася, што чакала студэнтаў.

Форум адкрыў прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі **Канстанцін КАЗАДАЕЎ**: «Наша доля ў рынку працы – 7-8 % выпускнікоў штогод. Аднак такімі лічбамі ацэньваць наш унёсак у ВУП краіны нельга, бо актуйна развіваецца эканоміка ведаў, дзе важныя кваліфікацыя, уменні, навыкі. Адзін высокакваліфікаваны спецыяліст можа забяспечыць гадавую выпрацоўку ў дзясяткі і сотні тысяч долараў. На іх і трымаецца рост эканомікі, растуць галіны, яны рухаюць наша грамадства і краіну наперад».

Арганізатар маштабнага мерапрыемства – Цэнтр кар'еры БДУ. Яго кіраўнік **Артур КАНДРАЦЕНКА** распавёў пра задачы форуму: «Галоўная – каб студэнты вызначылі сябе ў кар'еры і знайшлі прыдатную працу. Гэта вялікі этап дзейнасці студэнта: ён праходзіць этап ад абітурыента да студэнта, а потым становіцца работнікам. Кампаніі рознай скіраванасці хочуць, каб выпускнікі БДУ працавалі менавіта ў іх».

Сапраўды, сярод наймальнікаў – ЗАТ «БСБ Банк», Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь, лагістычныя і IT-кампаніі. Следчы камітэт цесна супрацоўнічае з юрыдычным факультэтам БДУ, да нас прыходзяць спачатку практыкантамі, а потым уладкоўваюцца на працу. Выпускнікі паказалі сябе з добрага боку, мы ў іх зацікаўлены», – паведаміў палкоўнік юстыцыі **Руслан ФЁДАРАЎ,** намеснік начальніка ўпраўлення, начальнік аддзела камплектавання ўпраўлення кадраў і ідэалагічнай работы цэнтральнага апарату Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь.

Жаданая метамарфоза «студэнт – работнік» адбылася з выпускніцай ФМА гэтага года **Дар'яй БУРДЫКА.** Свой кар'ерны рост яна пачала адразу на форуме: «Летась на Кар'ерным форуме – 2018 я падала заяўку на праходжанне сумоўя ў кампанію Primum, і зараз працую тут лагістам, часта адпраўляюся ў міжнародныя камандзіроўкі. Не бойцеся, вас усе чакаюць, вы маладыя, амбіцыйныя, вы студэнты найлепшага ўніверсітэта краіны. Тое, што ў вас няма досведу, плюс, а не мінус, я ў гэтым пераканана».

Магчымасць працаўладкавання адразу пасля ўніверсітэта пацвярджае **Таццяна КОТАВА,** в. а. начальніка Дэпартамента па працы з персаналам. Яна распавяла, што «БСБ Банк» працаўладкаваў у 2018 годзе каля дзесяці студэнтаў БДУ. «Яны зарэкамендавалі сябе з добрага боку: пазітыўныя, добразычлівыя, адкрытыя, знаходзяць агульную мову і з кліентамі, і з супрацоўнікамі. Мы праводзім конкурсы з Інстытутам бізнесу, найлепшыя студэнты трапляюць да нас на практыку», – адзначала яна.

Пазнаёміцца з кампаніямі, даведацца пра спецыфіку працы і свабодныя пазіцыі студэнты маглі на кірмашы вакансій і casespeech. Для ўдзельнікаў форуму супрацоўнікі кампаній правялі кароткія выступленні, звязаныя з падрыхтоўкай да працаўладкавання.

Прадстаўнік Qulix Systems **Наталля БУРЭЦ** зрабіла падрабязны агляд памылак на сумоўях: на якія дробязі звярнуць увагу, як размаўляць з рэкрутарамі па тэлефоне і адказваць на іх званкі. Спецыяліст параіла закладваць шмат часу на тэлефонную гутарку з рэкрутарам і гаварыць толькі па добрай сувязі – такія нязначныя, на першы погляд, дэталі выключуць цяжкасці ці дрэннае ўражанне, і вас могуць не запрасіць на сумоўе. Не варта забываць пра ветлівасць: нават калі вам сёння нецікавая вакансія, заўтра ўсё можа памяняцца, а вось грубы адказ застанецца.

**Наталля КАМЕЙША** з кампаніі EY дала парады па складанні рэзюмэ і падзялілася багатым досведам правядзення сумоўяў. На яго лепш не спазняцца і загадзя падрыхтавацца: даведацца пра кампанію, вызначыцца з мэтай працы ў кампаніі. Паклапаціцеся пра рэзюмэ, яно павінна адпавядаць рэчаіснасці. Не дадае «балаў» жаласлівы выгляд, манеры ўсёведа, ненатуральнасць і нелаяльнасць, нядольнасць задаваць пытанні, багацце не- і прафесійнага слэнгу.

**Кірыл САЎЧАНКА** з Wargaming растлумачыў, што і як вучыць студэнту, каб увайсці ў сферу распрацоўкі гульняў. Ён падкрэсліў, што ўніверсітэцкая тэхнічная адукацыя дае магутную базу, якая заўсёды спатрэбіцца ў IT-кар'еры.

Выпрабаваць атрыманыя веды студэнты маглі на хутких сустрэчах з рэальным HR-спецыялістамі кампаній: некаторыя студэнты атрымалі прапановы прайсці сумоўе!

**Надзея МАРХЕЛЬ**

# Сучасныя напрамкі развіцця фізічнай геаграфіі

На факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі 13–15 лістапада прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Сучасныя напрамкі развіцця фізічнай геаграфіі: навуковыя і адукацыйныя аспекты ў мэтах ўстойлівага развіцця». Яна была прысвечана адразу двум юбілеям: 85-годдзю факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі і 65-годдзю Беларускага геаграфічнага таварыства.

Гаспадыняй мерапрыемства выступіла кафедра фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій. Каля 200 навукоўцаў-географаў і педагогаў з 7 краін выступілі з дакладамі, дзяліліся навуковымі поглядамі падчас круглых сталоў і вопытам выкладчыцкай дзейнасці на педагагічнай майстэрні. Адкрываў працу канферэнцыі прарэктар па навуковай рабоце БДУ *Васіль Сафонаў* і дэкан ФГГ *Дзмітрый Курловіч*.

Прафесар *Мікалай Клебановіч* (БДУ) расказаў пра дасягненні і праблемы вывучэння глебаў Беларусі. Цікавасць у прысутных выклікаў даклад *Дзмітрыя Грумо* пра інвентарызацыю і ацэнку сучаснага стану біялагічнай разнастайнасці нацыянальнага парку «Белавежская пушча» з дапамогай дыстанцыйных і геаінфармацыйных метадаў. *Галіна Выхаванец* (Адэскі нацыянальны ўніверсітэт імя І. І. Мечнікава) распавяла пра асноўныя заканамернасці змены марскога краю Кілійскай дэльты Дуная. *Аксана Кліманава* (МДУ імя М. В. Ламаносава) – пра зялёную інфраструктуру як ключавы элемент устойлівага развіцця постіндустрыяльных гарадоў. *Антон Букатаў* (Федэральны даследчы цэнтр «Марскі гідрафізічны інстытут РАН») абмеркаваў прастора-часавую зменлівасць марскога лёду ў Арктычным басейне.

133 даклады былі заяўлены ў час працы чатырох секцый:

- «Тэорыя і метадалогія фізічнай геаграфіі. Сучасныя метады і тэхналогіі фізіка-геаграфічных даследаванняў. Геаінфармацыйнае картаграфаванне прыродных рэсурсаў»,
- «Рацыянальнае прыродакарыстанне і ўстойлівае развіццё рэгіёнаў»,
- «Актуальныя праблемы палеагеаграфіі і біягеаграфіі. Асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі. Краязнаўства і зялёны турызм»,
- «Рэгіянальная тапаніміка і анамастыка. Методыка выкладання геаграфіі. Адукацыя для ўстойлівага развіцця. Гісторыя Беларускага геаграфічнага таварыства».

Прэзентавалі вынікі шматгадовай дзейнасці прадстаўнікі найбуйнейшых ВНУ і навукова-даследчых устаноў, у тым ліку каля 80 дактароў навук.

Сумесна са стартап-цэнтрам БДУ быў праведзены *круглы стол «Ад навукі да бізнесу»*, які азнаёміў студэнтаў з экасістэмай стартапаў у Беларусі, арганізацыяй працы стартапаў у БДУ. А падчас *круглага стала «Адаптацыя да змянення клімату ў Беларусі: практыкі ўключэння грамадскасці»* эксперты праектаў TeRRIFICA і BSRCCC абмяркоўвалі ўмовы і магчымасці ўключэння грамадскасці ў распрацоўку практык адаптацыі да кліматычных зменаў на пілотнай тэрыторыі Мінска. Сустрэча была арганізавана сумесна з праектам «TeRRIFICA: Адказныя даследаванні і інавацыі ў рэгіёнах як метад падтрымкі інавацыйных дзеянняў у абароны клімату», што рэалізуецца ў кансорцыуме міжнародных партнёраў асацыяцыі «Адукацыя для ўстойлівага развіцця» ў Беларусі.

У рабоце педагагічнай майстэрні прынялі ўдзел больш за 30 педагагічных работнікаў вышэйшых і сярэдніх агульнаадукацыйных устаноў, устаноў дадатковай адукацыі дарослых. Дзеля прафесійнага ўдасканалення настаўнікаў правялі 5 майстар-класаў. Тэмы былі розныя: развіццё пазнавальнай цікавасці навучэнцаў на ўроках геаграфіі з дапамогай выкарыстання тэхналогіі «перавернуты ўрок», інтэрнэт-рэсурсы ў арганізацыі кіравання вучэбнай дзейнасцю навучэнцаў, выкарыстанне дэманстрацыйных шырокафарматных табліц пры выкладанні фізічнай геаграфіі ў сярэдняй школе.

Падчас канферэнцыі прайшоў сапраўдны лектарскі марафон замежных навукоўцаў-географаў: цыкл адкрытых лекцый, прачытаных вядомымі географамі Расіі і Украіны. *Юрый Шуйскі* (Адэскі нацыянальны ўніверсітэт імя І. І. Мечнікава) распавёў пра геаграфію прыморскіх азёр Чарнаморскага ўзбярэжжа. *Сяргей Еўдакімаў* (Смаленскі дзяржаўны ўніверсітэт) – пра ледніковую тэорыю. *Аксана Кліманава* (МДУ імя М. В. Ламаносава) распавяла пра трансфармацыю землянага покрыва на загальным і макрарэгіянальным узроўні. *Лідзія Аляксеева* (грамадская арганізацыя «Расійскі саюз гідрагеолагаў») прачытала лекцыю пра актуальныя пытанні комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў басейнаў галоўных рэк еўрапейскай тэрыторыі Расіі.

Навукова-практычная канферэнцыя прадэманстравала ўражлівыя дасягненні і вялікі патэнцыял беларускіх навукоўцаў-географаў і педагогаў у вырашэнні найважнейшых геаграфічных задач.

**Кацярына МАЦЮШЭЎСКАЯ**

**ДАВЕДКА**

Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі – адзін з найстарэйшых факультэтаў БДУ. Гэта найбуйнейшы ў краіне вучэбна-навуковы цэнтр па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне шырокага спектра геаграфічных дысцыплін. Арганізатарам юбілейнай канферэнцыі выступіла кафедра фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій, якая на працягу ўсёй гісторыі з'ўлялася крыніцай развіцця факультэта, распрацоўвала асноўныя напрамкі вучэбна-метадычнай дзейнасці ў галіне сярэдняй і вышэйшай адукацыі.

УНІВЕРСІТЭТ
31 снежня 2019 года, № 16 (2222)







# Рэнесанс бібліятэкі

**Як адпавядаць рэаліям інфармацыйнага грамадства, павысіць у чатыры разы наведвальнасць і запатрабаванасць універсітэцкай бібліятэкі, ведаюць у БДУ.**

## Традыцыі і інавацыі

«У бібліятэцы павінна быць жыццё», – сцвярджае дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ **Уладзімір Кулажанка,** разважаючы пра месца і задачы ўніверсітэцкай бібліятэкі ў лічбавым асяроддзі. Гістарычна склалася, што бібліятэка з'яўляецца месцам «ціхіх» заняткаў. «Мы ж паспрабавалі адысці ад стандартнага погляду і стварыць атмасферу ўзаемадзеяння і камунікацыі. Мы дазволілі нашым студэнтам тут размаўляць».

Інфармацыя сыходзіць у лічбавую прастору, а разам з ёй і студэнт паглыбляецца ў гаджэт. «Мы сталі прадумваць шляхі „звароту“ моладзі ў чытацкае асяроддзе і шукаць рашэнні гэтай праблемы. Выснова была адна – гэта стварэнне ўнікальнай пляцоўкі, дзе ёсць традыцыі і інавацыі».

Сёння БДУ мае адну з найлепшых у свеце электронных бібліятэк. Паводле міжнароднага рэйтынгу Transparent Ranking of Repositories, яна займае трэцяе месца сярод універсітэцкіх бібліятэк і 12 – у сусветным топ-лісце. Сярод айчынных ВНУ БДУ мае найбольш поўную падпіску на навуковыя электронныя рэсурсы і забяспечвае доступ больш чым да 30 рэфератыўных і паўнатэкставых баз даных, такіх як Scopus, Web of Science, Springer Link, ScienceDirect, EBSCO і інш. Тут размяшчаюцца найбольш аўтарытэтныя публікацыі навукоўцаў з усяго свету. Кожны студэнт і супрацоўнік БДУ абсалютна бясплатна можа пазнаёміцца з найбольш уплывовымі даследаваннямі сусветнага ўзроўню.



*Уладзімір Кулажанка*

«Такім чынам, для нашых карыстальнікаў мы прывабныя сваім эксклюзівам і перавагай перад сусветным павуціннем. Бо шматлікія даступныя ў БДУ інфармацыйныя крыніцы закрыты для карыстальнікаў у інтэрнэце», – падкрэслівае Уладзімір Кулажанка. Акрамя таго, супрацоўнікі бібліятэкі актыўна кансультуюць акадэмічны персанал універсітэта па пытаннях публікацыйнай актыўнасці, фарміравання лічбавага партфоліа навукоўца, а таксама эфектыўнага лічбавага прасоўвання вынікаў навуковай дзейнасці.

## Ад віртуальнасці да рэальнасці

У БДУ ролю цэнтра бібліятэкі выконвае навуковая зала ў галоўным корпусе ВНУ. Гэта найбуйнейшы адкрыты фонд спецыялізаванай літаратуры ў Беларусі. У свабодным доступе тут знаходзіцца больш за 65 тысяч асобнікаў розных выданняў і перыёдыкі.

Перад кіраўніцтвам бібліятэкі стаяла велізарная задача «прыручыць» студэнта да бібліятэкі. Рашэнню спрыяў і рамонт, завершаны ў чытальнай зале ў канцы 2018 года. «Важным было не толькі абнаўленне сцен, падлогі і вокнаў. Трэба было па-іншаму арганізаваць прастору з улікам менталітэту і запатрабаванняў сучаснага студэнта», – дзеліцца сакрэтамі кіраўнік Фундаментальнай бібліятэкі.

Над новым вобразам навуковай залы працавалі запрошаныя дызайнеры факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ. Яны прапанавалі каляровае афармленне і выкарыстанне ў якасці дэкору сцен студэнцкія мастацкія працы.

Галоўнай навінкай стала дзяленне прасторы залы на зоны рознай актыўнасці. Так утварыліся «гучная» пляцоўка для настольных гульняў, зносінаў, працы над навучальнымі або грамадскімі праектамі, стартап-ідэямі і «ціхія» месцы для падрыхтоўкі да заняткаў, вывучэння літаратуры. Навуковая зала пасля рамонту павялічылася да 70 пасадачных месцаў. На працоўных месцах усталяваны камп'ютары, забяспечаны доступ да бесправаднога інтэрнэту.

## Да 500 наведвальнікаў у дзень, і гэта не мяжа

«Мы імкнёмся стварыць камфортныя ўмовы на любым этапе наведвання бібліятэкі і задаволіць любую патрэбу нашых чытачоў. Немагчыма ўявіць запатрабаванасць бібліятэкі з фанернымі партамі і крэсламі. Студэнтам неабходна крэатыўная прастора. Усё павінна спрыяць раскрыццю яго творчай асобы і патэнцыялу», – упэўнены дырэктар.

Цяпер па ўсім свеце актыўна ствараюцца розныя стартап-цэнтры, каворкінгі і фаблаб-платформы. «Гэтыя гучныя назвы хаваюць тое, што сёння мае БДУ, – бібліятэку. Тут ёсць уся неабходная інфраструктура: інтэрнэт, друкарскі цэнтр, 3D-прынтар, фактычна, той функцыянал каворкінгу, за які даводзіцца плаціць», – рэзюмуе дырэктар. Гэта ўнікальнае асяроддзе стала магнітам для навучэнцаў і выкладчыкаў. За апошні год колькасць наведвальнікаў толькі навуковай залы ўзрасла да 500 чалавек у дзень, што ў чатыры разы перавышае паказчыкі леташніх гадоў.

## Маркетынгавая стратэгія: «кліент заўсёды мае рацыю»

Шматгадовая праца Фундаментальнай бібліятэкі БДУ даказвае, што лічбавыя тэхналогіі не выцясняюць, а спрыяюць якаснай змене бібліятэчных паслуг, паляпшэнню камунікацыі паміж персаналам і чытачамі. Выконваючы традыцыйную функцыю інфармацыйнага забеспячэння навучальнага працэсу, бібліятэцы ўдаецца адпавядаць актуальным запытам чытачоў, актыўна кантактаваць з імі, у тым ліку ў віртуальным асяроддзі.

Па словах кіраўніка, бібліятэка, з пункта погляду маркетынгу, такая ж арганізацыя абслугоўвання, як добрае кафэ ці крама, і тут варта выкарыстоўваць тыя ж прынцыпы і падыходы. «Магчыма, гэта не заўсёды адпавядае менталітэту некаторых бібліятэкараў, але для нас прынцыповая пазіцыя – выключна ветлівае стаўленне да нашых карыстальнікаў, нават калі яны часам заходзяць у куртках ці з заплечнікамі. У нас дзейнічае залатое правіла абслугоўвання: „кліент заўсёды мае рацыю“. Усе ініцыятывы па паляпшэнні працы, якія з'яўляюцца ў нашай бібліятэцы, зыходзяць ад нашых супрацоўнікаў. Яны ўкладваюць сябе, ахвяруюць вольным часам, імкнуцца стварыць атмасферу хатняй утульнасці, нават частуюць студэнтаў хатняй выпечкай, цукеркамі, гатуюць чорны і травяны лячэбны чаі». У «гучнай» зоне ёсць бойлер для нагрэву вады, мікрахвалевая печ. Так утварыўся «фуд-кут», дзе кожны ахвотнік можа прыгатаваць чай, каву ці разагрэць ежу. «Цяпер я назіраю, як моладзь праводзіць на нашай пляцоўцы дні нараджэння і іншыя значныя святы. І гэта вельмі радуе. Ёсць адчуванне задавальнення, спакою і даверу студэнта. Гэта таго варта».

**Гутарыла Паліна ДАЎГІЛЕНКА**

## ДАВЕДКА

Фундаментальная бібліятэка БДУ заснавана 23 мая 1921 года. У верасні 1922 года пастановай Саўнаркама БССР была пераўтворана ў «Беларускую дзяржаўную і ўніверсітэцкую бібліятэку». У 1926 годзе было прынята рашэнне пра вылучэнне Дзяржаўнай бібліятэкі (цяпер – Нацыянальная бібліятэка) са складу БДУ. Фундаментальная бібліятэка працягнула сваю працу як універсітэцкая.

У наш час фонд айчыннай і замежнай літаратуры складае каля 2 млн дакументаў. Да паслуг чытачоў прадстаўлена 15 інфармацыйных зал, размешчаных у 10 карпусах універсітэта. Штогод фіксуецца больш за 1,3 млн зваротаў да інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

31 снежня 2019 года
Падпісана да друку 30.12.2019 г.
Зак. 739. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by